**УДК 94 |638| (476)**

# ЛАКАЛЬНЫЯ ГРУПЫ ГАРАДЗІШЧАЎ ЖАЛЕЗНАГА ВЕКУ Ў ВЯРХОЎЯХ Р. ВІЛІЯ І БЯРЭЗІНА (ДНЯПРОЎСКАЯ)

***І.С. КАМІНСКІ***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, праф. Д.У. ДУК)***

*Дапоўнены і скарэктаваны вылучаныя А.М. Мядзведзевым лакальныя групы гарадзішчаў жалезнага веку ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская)*

Актывізацыя працэсу рассялення з 1 ст. н.э. у вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) абумовіла з’яўленне лакальных груп гарадзішчаў у адзначаным рэгіёне. Групы гарадзішчаў адпавядаюць рассяленню родавых калектываў людзей. Паселішчы рамяшчаліся “гнёздамі” (2-3 гарадзішчы). Адно гарадзішча засялялася адной патрыярхальнай сям’ёй. Група гарадзішчаў належыла родаваму калектыву людзей [1, с. 99].

У вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) вылучаюцца лакальныя групы гарадзішчаў жалезнага веку. На аснове карты В.І. Шадыры, З.А. Харытановіч вылучае Докшыцкую лакальную групу гарадзішчаў [2, с. 98]. А.М Мядзведзеў, прааналізаваўшы працэс рассялення плямён культуры штрыхаванай керамікі, называе тры вобласці груповання пасяленняў. Вярхоўі р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) адносяцца да другой вобласці, якая ўключае басейн р. Віліі і тэрыторыю сярэдняй Беларусі. Другая вобласць падзяляецца на чатыры раёны. Гарадзішчы басейна вярхоўяў р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) уваходзяць у паўночны і цэнтральны раёны. Раёны падзяляюцца на групы. Паўночны раён уключае групы гарадзішчаў ў вярхоўі р. Сэрвач, Бярэзіна і воз. Лепель. Паселішчы вярхоўяў р. Вілія і Двінаса, міжрэчча Віліі Бярэзіны (Дняпроўскай) уключаны ў шостую групу цэнтральнага раёна. Разам з гэтым, А.М. Мядзведзеў адзначае тэндэнцыю да абасаблення ўнутры адной групы. Так, вылучаюцца падгрупы ў вярхоўі р. Бярэзіны і воз. Лепель адпаведна. Шостая група падзяляецца на тры падгрупы, дзе групы гарадзішчаў басейна р. Двінаса і міжрэчча Віліі і Бярэзіны (Дняпроўскай) імкнуцца адна да адной [3, с. 79-80]. Пры нанясенні на карту груп гарадзішчаў ў вярхоўях р. Сэрвач і Бярэзіна (Дняпроўская) і басейна р. Сэрвач бачна іх размежаванне з суседнімі групамі рэкамі і забалочанай мясцовасцю (мал. 1).

Лакальныя групы гарадзішчаў па ніжнім цячэнні р. Сэрвач абмежаваны ад астатніх гарадзішчаў (шостай групы па А.М. Мядзведзеву) забалочанай р. Вілія. Вылучаная А.М. Мядзведзевым лакальная група ў вярхоўі р. Бярэзіна падзелена забалочаным вярхоем р. Бярэзіна.

Заходняй мяжой акрэсленага рэгіёна з’яўляецца месцамі забалочаная р. Сэрвач. З поўдня рэгіён абмежаваны р. Вілія з забалочанай поймай. З поўначы на ўсход адзначаную тэрыторыю агінае вярхоўе р. Бярэзіна (Дняпроўская). З поўначы да вярхоўя р. Бярэзіны (Дняпроўская) прымыкае балотны масіў Галубіцкай пушчы. Значэнне рэк і забалочанай мясцовасці як фактара адасаблення лакальных груп на акрэсленай тэрыторыі ад іншых груп у памежных рэгіёнах, вылучаных А.М. Мядзведзевым, дае падставу разглядаць вярхоўі р. Вілія і Бярэзіна як агульны рэгіён для даследавання.

Разам з гэтым, на акрэсленай тэрыторыі знаходзяцца неабследаваныя гарадзішчы і помнікі, датыроўка якіх патрабуе ўдакладнення [4; 5]. Мэта даследавання заключаецца ў дапаўненні і карэктыроўцы вылучаных А.М. Мядзведзевым і З.А. Харытановіч лакальных груп гарадзішчаў на даследуемай тэрыторыі. Удакладненне датыровак вядомых помнікаў і адкрыццё невядомых помнікаў археалогіі дазволіць скарэктаваць прапанаваны намі варыянт вылучаных груп гарадзішчаў жалезнага веку ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская).

У вярхоўі р. Вілія і Бярэзіна вылучаецца 5 груп гарадзішчаў. Групы названы па найбольш даследаванаму гарадзішчу. Крытэрымі для вылучэння лакальных груп сталі прыналежнасць гарадзішчаў да адной ракі, адлегласць паміж гарадзішчамі і храналагічнае падабенства помнікаў.

Вылучаныя А.М. Мядзведзевым лакальныя групы гарадзішчаў у вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) патрабуюць карэктыроўкі. Так, па выніках картаграфавання лакальнай групы гарадзішчаў у вярхоўі р. Сэрвач, вылучанай А.М. Мядзведзевым, яе можна раздзяліць на дзве групы гарадзішчаў (Варганскую і Глыбоцкую). Разам з гэтым Глыбоцкая група гарадзішчаў адносіцца да левабярэжных прытокаў р. Заходняя Дзвіна, што выходзіць за межы нашага даследавання. Неабходна адзначыць, што гарадзішча Варганы А.М. Мядзведзевым было аднесена да лакальнай групы ў ніжнім цячэнні р. Сэрвач [6, с. 109]. Пры нанясенні на карту згаданага гарадзішча бачна яго прыналежнасць да вярхоўя р. Сэрвач. Варганскую групу можна дапоўніць Гарадзішчам (Ваўкалацкага с/с), інфармацыя аб якім была верыфікавана ў выніку археалагічных разведак аўтара сумесна з краязнаўцам Дз.І. Грабоўскім у 2014 г. і гарадзішчам Латыголь. Для ўдакладнення перыяду існавання Варганскай групы гарадзішчаў неабходна вызначыць датыроўку Гарадзішча (Ваўкалацкі с/с) і ўдакладніць датыроўку гарадзішча Латыголь

(датуецца жалезным векам) [7, с. 233]. Наяўнаць земляных абарончых збудаванняў на Гарадзішчы (Ваўкалацкі с/с) дае падставу меркаваць аб функцыянаванні пасялення ў першай паловай I тыс.н.э. Паколькі тры гарадзішчы Варганскай групы знаходзяцца на аднолькавай адлегласці адзін ад аднаго (каля 10 км), то, верагодна, яны існавалі ў адзін час. Для нармальнага функцыянавання пасяленняў жалезнага веку, пры панаванні падсечна-агнявога земляробства, адлегласць паміж імі павінна складаць 10 км [6, с. 14]. Перыяд функцыянавання Варганскай групы магчыма датаваць на аснове датыроўкі гарадзішча Варганы (3-4 ст. н.э.) [8, с. 145], якая на дадзены момант з'яўляецца самай вузкай.




Мал. 1. Групы гарадзішчаў жалезнага веку ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская):

I – Варганская група (9 – Гарадзішча (Ваўкалацкі с/с), 10 – Латыголь, 11 – Варганы); II – Равячкаўская група (7 – Баравічы, 8 – Равячкі); III – Малышкаўская група (6 – Баравыя, 4 – Даўгінава, 5 – Малышкі); IV – Вітунічская група (14 – Асінавік, 13 – Вітунічы, 12 – Старое Запонне); V – Бірульская група (3 – Беразіно, 1 – Бірулі); VI – Глыбоцкая група, 2 – Гарадзішча (Бярозаўскі с/с);

*а* – гарадзішчы, на якіх праводзіліся археалагічныя раскопкі; *б* – гарадзішчы, датыроўка якіх патрабуе ўдакладнення; в – забалочанная мясцовасць)

Гарадзішчы лакальнай групы ў ніжнім цячэнні р. Сэрвач можна раздзяліць на Малышкаўскую і Равячкаўскую групы. Пры гэтым, яны маглі ўяўляць сабой адну лакальную групу, паколькі вядомыя датыроўкі гарадзішчаў (Баравыя, Даўгінава, Малышкі, Равячкі) адпавядаюць 1-4 стст. н.э. [9, с. 140; 10, с. 142; 11, с. 58; 12, с. 242]. Датыроўка гарадзішча Баравічы невядома. Помнік быў разбураны ракой. Вядома, што пасяленне было ўмацавана 2 валамі [6, с. 78]. Адпаведна, гарадзішча, магчыма, адносіцца да першай паловы I тыс. н.э. Улічваючы, што гарадзішчы па ніжнім цячэнні р. Сэрвач датуюцца 1-4 ст. н.э., датыроўку гарадзішча Баравічы прымем за 1-4 ст. н.э. Падставай для вылучэння двух груп у ніжнім цячэнні р. Сэрвач стала аддаленасць гарадзішчаў Равячкаўскай групы (Баравічы, Равячкі) ад гарадзішчаў Баравое і Малышкі па цячэнні р. Сэрвач.

Гарадзішчы ў вярхоўі р. Бярэзіна складаюць дзве групы гарадзішчаў. Бірульская група гарадзішчаў знаходзіцца непасрэдна на правабярэжжы р. Бярэзіна. Названая група ўключае гарадзішчы Беразіно і Бірулі. Група дзейнічала з мяжы эр да канца жалезнага веку [13, с. 102; 14, с. 258].

Вітунічская група знаходзіцца на правабярэжжы р. Поня (правы прыток р. Бярэзіна). Пры супастаўленні датыровак гарадзішчаў існаванне Вітунічскай групы адпавядае 3-4 стст. н.э. [15, с. 244; 16, с. 167; 17, с. 256].

Паколькі група гарадзішчаў належыла роду, верагодна, у 3-4 ст. н.э. у вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) пражывала 5 радоў. А.М. Мядзведзеў адначае, што ў сярэднім на адным гарадзішчы пражывала 70-100 чалавек [6, с. 14]. В.І. Шадыра, Э.М. Загарульскі колькасць насельніцтва на адным гарадзішчы вызначаюць у межах 50-75 чалавек [1, с. 99]. Неабходна адзначыць, што высновы А.М. Мядзведзева адносна колькасці насельніцтва на адным гарадзішчы зроблены, улічваючы

тэндэнцыю да павелічэння плошчы пляцоўкі гарадзішчаў у напрамку з поўдня на поўнач арэала культуры штрыхаванай керамікі. Высновы В.І. Шадыра грунтуюцца на аналізе матэрыялу гарадзішчаў днепра-дзвінскай культуры. Вярхоўі р. Віліі і Бярэзіны (Дняпроўская) знаходзяцца на поўначы арэала культуры штрыхаванай керамікі і поўдні днепра-дзвінскай культуры. Адсюль, сярэднюю колькасць насельніцтва на адным гарадзішчы ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) неабходна прыняць за 70 чалавек. Такім чынам, колькасць насельніцтва ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна (Дняпроўская) у 3-4 ст. н.э. складала прыкладна 900 чалавек.

Такім чынам, у перыяд 1-4 стст. н.э. функцыянавалі Бірульская (Бірулі, Беразіно), Малышкаўская (Баравое, Даўгінава, Малышкі) і Равячкаўская (Баравічы, Равячкі) групы гарадзішчаў. У 3-4 стст. н.э. дзейнічалі Варганская (Варганы, Гарадзішча (Ваўкалацкі с/с), Латыголь) і Вітунічскія групы (Асінавік, Вітунічы, Старое Запонне). Адпаведна на працягу 1-2 ст. н.э. існавалі Бірульская, Малышкаўкая і Равячкаўская групы агульнай колькасцю 7 гарадзішчаў. У 3 ст. н.э. з'яўляюцца Варганская і Вітунічская групы агульнай колькасцю 6 гарадзішчаў і адначасова з імі працягваюць функцыянаваць Бірульская, Малышкаўская і Равячкаўская групы гарадзішчаў. Назіраецца рэзкае павелічэнне шчыльнасці насельніцтва ў 1 ст. н.э. Так, у перыяд сярэдзіны І тыс. да н.э.-1 ст. н.э. дзейнічалі 2 гарадзішчы (Бірулі, Гарадзішча (Бярозаўскі с/с)). У 1 ст. н.э. унікаюць 6 гарадзішчаў (Баравічы, Баравыя, Беразіно, Даўгінава, Малышкі, Равячкі). Найбольшая шчыльнасць насельніцва ў вярхоўях р. Вілія і Бярэзіна існавала ў 3-4 стст. н.э. (13 гарадзішчаў).

ЛІТАРАТУРА


1. Шадыра, В.І. Беларускае Падзвінне (І тысячагддзе н.э.) / В.І. Шадыра. – Мінск : Ін-т гісторыі НАН Беларусі, 2006. – 150 с. ; іл.
2. Харитонович, З.А. Керамика городищ Северной Беларуси / З.А. Харитонович // Беларускае Падзвінне : вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку) : зб. навук. прац рэсп. навук.-практ. семінара, Полацк, 20-21 лістап. 2008 г. / пад агульн. рэд. Д.У. Дука, У.А. Лобача. – Наваполацк : ПДУ, 2009. – С. 97-105.
3. Медведев, А.М. Поселения культуры штрихованной керамики (некоторые экономические и социальные аспекты в расселении) / А.М. Медведев // Гістар.-археалаг. зб. – 1994. – № 3. – С. 74 – 102.
4. Поболь, Л.Д. Археологические памятники Белоруссии: Железный век / Л.Д Поболь. – Минск : Наука и техника, 1983. – 456 с. : ил.
5. Штыхов, Г.В. Археологическая карта Белоруссии. Памятники железного века и эпохи феодализма / Г.В. Штыхов. – Минск : Полымя, 1971. – Вып. 2. – 276 с.
6. Медведев, А.М. Белоруское Понеманье в раннем железном веке (1 тысячелетие до н.э. – 5 в. н.э.) / А.М. Медведев. – Минск, 1996. – 200 с. : ил.
7. Латыголь // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 233.
8. Штыхаў, Г.В. Варганы / Г.В. Штыхаў // Археалогія Беларусі : энцыкл. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. А-К. – С. 145.
9. Звяруга, Я.Г. Баравыя / Я.Г. Звяруга // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 140.
10. Мітрафанаў, А.Р. Даўгінава / А.Р. Мітрафанаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 142.
11. Шадыра, В.І. Малышкі / В.І. Шадыра // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. Л-Я. – С. 58.
12. Мітрафанаў, А.Р. Равячкі / А.Р. Мітрафанаў // Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2. Л-Я. – С. 242.
13. Ільюцік, А.У. Беразіно / А.У. Ільюцік // Археалогія Беларусі : энцыкл. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. А-К. – С. 102.
14. Харытановіч, З.А. Археалагічныя даследаванні на гарадзішчы Бірулі ў 2012 годзе / З.А. Харытановіч // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – 2014. – Вып. 25. – С. 252 – 258.
15. Мітрафанаў, А.Р. Асінавік / А.Р. Мітрафанаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 244.
16. Кенька, П.М. Вітунічы / П.М. Кенька, А.В. Вайцяховіч // Археалогія Беларусі: энцыкл. У 2 т. / рэдкал. : Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1. А-К. – С. 167-168.
17. Мітрафанаў, А.Р. Старое Запонне / А.Р. Мітрафанаў // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. кал. : С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Сав. Энцыкл., 1985. – С. 255-256.